**Г.М. Канцавая** (Беларусь, Брэст)

# ПАРАЎНАННЕ ЯК КАМПАНЕНТ ПАЭТЫЧНАГА ІДЫЯСТЫЛЮ Я. ЯНІШЧЫЦ

У паэзіі Я. Янішчыц значнае месца займаюць параўнанні, галоўная мэта якіх – данесці, раскрыць задуму аўтара, настрой лірычнага героя, дапамагчы аўтару выразіць свой пункт погляду, апісаць розныя прадметы і з’явы.

Адной з найважнейшых прымет удалага параўнання з’яўляецца элемент нечаканасці, навізны, арыгінальнасці. Толькі ў гэтым выпадку параўнанні вобразнай форме выражаюць сутнасць прадмета, надаюць экспрэсіўнасць і выразнасць маўленню.

Традыцыйна параўнанне разумеецца як сінтаксічна чляніма моўная адзінка, якая валодае вобразнасцю, параўнальнай семантыкай, складаецца з суб’екта (з’явы ці прадмета, які падпадае пад вобразнае супастаўленне), аб’екта (наймення з’явы ці прадмета, з якімі параўноўваецца элемент навакольнай рэчаіснасці), асновы супастаўлення (агульных прымет, якія ўласцівы суб’екту ці аб’екту) і аформленая з дапамогай спецыфічных фармальных сродкаў выражэння параўнальнага значэння. Каштоўнасць параўнання ў тым, што збліжэнне розных прадметаў дапамагае раскрыць у аб’екце параўнання, акрамя асноўнай прыметы, таксама шэраг дадатковых, што значна ўзбагачае мастацкае ўражанне.

Па характары сувязі кампанентаў параўнанні могуць быць злучнікавымі і бяззлучнікавымі.

Найбольш часта ў творчасці Я. Янішчыц сустракаюцца злучнікавыя параўнанні з нейтральным злучнікам *як: Гэты край мне, ведама, знаёмы – Ён такі ж чуллівы, як і Вы* [1, с. 118]; *Гэты бор я дзесьці сустракала – Ён такі ж бяссонны, як і Вы* [1, с. 118]; *У лёгенькім, як вецер, паліто, нясмелая, нагадваю лілею* [1, с. 209].

Параўнанні ў творах Я. Янішчыц далучаюцца і пры дапамозе злучнікаў *быццам, як быццам, бы, што* і інш.: *У галасах, бы ў каласах, нам ёсць патрэба* [1, с. 195]; *Юнацтва бессардэчнае ўдарыць, быццам гром [1, с. 11]; І квас капусны будзе, што віно* [1, с. 32]; *Гадзіна, нібы бэзавае ранне, прайшла (хоць гэта блізка), а наўзбоч* [1, с. 208]. Гэтыя ж злучнікі могуць далучаць і даданыя параўнальныя часткі складаназалежных сказаў: *Нахлыну так, нібы з гары абвал вясновы* [1, с. 195]; *Гэтак думала прапасці, як былінка на зямлі…* [1, с. 215].

Выкарыстоўваюцца паэтэсай і параўнанні фразеалагічнага тыпу: *І не цела бязважкасць – ноч мяккая, як пух* [1, с. 176]; *Як галубы, сівеюць аднагодкі на самай чуйнай лініі жыцця* [1, с. 115]. Падобныя параўнанні

надаюць вершаваным радкам Я. Янішчыц натуральнасць, прастату. Аднак адзначым, што выкарыстанне аўтарам устойлівых параўнанняў ані ў якім разе не ўказвае на прымітыўнасць яе таленту. Наадварот, удала выкарыстаныя ўстойлівыя параўнанні робяць творы паэтэсы больш каларытнымі. яркімі, семантычна насычанымі.

Бяззлучнікавыя параўнанні ў структуры простага сказа выконваюць звычайна прэдыкатыўную функцыю (адсюль і іх назва «прэдыкатыўныя параўнанні»). Гэтыя параўнанні выражаны творным склонам назоўніка: *Але на мне свінцовай мукай адбіўся твой глыбінны лёс* [1, с. 49]; *Дажджавая нітка лёсу мамы вырасла высокаю травой* [1, с. 95]; *Стаю ля брацкае магілы высокім ценем васілька* [1, с. 213]; *Самота ўспыхне белай сцюжаю…* [1, с. 179]; *Адплыве ён караблём наранку, залатой мігнуўшы галавой…* [1, с. 93]; *… то ластаўкаю першай, то рабінай пастукаюся ў чуйнае акно* [1, с. 22]; *І брагай хмеліць маладое сена* [1, с. 32]; *Арабінай днела позняю ў агеньчыках сяло* [1, с. 121].

Асобай формай вобразнага параўнання з'яўляюцца адмоўныя параўнанні, у якіх адзін прадмет супрацьпастаўляецца другому*: І не гадзіннік цінькае ў цішы, а трапяткое сынавае сэрца* [1, с. 146]; *Яна зусім не лёгкія аблокі, не песня, што пяецца «на дазволь». Яна – мой хлеб няпросты і нялёгкі. Яна – зямлёй пасоленая соль* [1, с. 9]. У адмоўных параўнаннях вонкава з'явы асобныя, аднак унутрана збліжаныя.

Параўнанне можа стварацца і з дапамогай слоў, якія прама ўказваюць на падобнасць з'яў: *падобны, напамінае, здаецца* і інш: *Хай будзе хлопчык мой падобны на сіні лён, на чысты снег* [1, с. 180]; *На дождж, на гром, на ясны промень падобна музыка мая* [1, с. 132].

Да параўнанняў адносяцца звароты з выкарыстаннем ступені параўнання прыметніка ці прыслоўя: *Лягчэй пушынкі і мацней малітвы была мая пяшчота да цябе* [1, с. 189]; *Раней ад зоркі будзеш уставаць, даіць кароў, і прыдумваць стравы…* [1, с. 26]; *– Ты косіш сена, колеш дровы мудрэй равеснікаў-мужчын* [1, с. 49]; *… была святлейшая ад промня правінцыяльная туга* [1, с. 68]; *…піша цётка, што святлей кудзелі: «З дарагой душы прыедзь да нас. Дзела е. І ягадкі паспелі»* [1, с. 69].

Параўнанні служаць для вобразнага апісання самых розных прымет прадмета, якасцяў, дзеянняў, напрыклад параўнанне дапамагае даць дакладнае апісанне колеру: *Як завіруха белая, як белая сцяна, нявеста пасівелая прымоўкла ля акна* [1, с. 10]; *А ў лоеўскай дзяўчынкі – дзве донечкі, як лён* [1, с. 123]; *А памяць то гарчэй, то балючэй нахлыне, нібы перавал гарачы* [1, с. 59].

Супастаўляемыя прадметы могуць збліжацца на аснове падабенства функцый: *І шаткунок снуе, нібы чаўнок* [1, с. 32].

З дапамогай параўнанняў паэтэса стварае цэлыя мастацкія карціны, дае апісанне прадметам. Карыстаецца як агульнамоўнымі (*Стане смага, стане скруха мучыць, дождж пральецца, нібы з рукава…* [1, с. 95]) параўнаннямі, так і індывідуальна-аўтарскімі: *А вуліцы, адкрытыя, як язвы, – хоць і вітрыны золатам зіхцяць* [1, с. 76]; *Туга, як хмуры панядзелак. Пагосты. Ніцыя кусты* [1, с. 110]. У такіх параўнаннях найбольш ярка адлюстроўваецца ўласцівае толькі Я. Янішчыц індывідуальнае ўспрыманне рэчаіснасці.

Параўнанні ў творах Я. Янішчыц выконваюць як выяўленчую (*Запомню, поле, твой абрыс, – тут горача, бы ў мліва* [1, с. 37]; *І для цябе мой дом адкрыты, нібы поле* [1, с. 147], так і вобразную (*Ды вочы, як позняя восень, прабіліся скрозь сіняву…* [1, с. 55]; *Маршчыны, нібы каляіны, прарэзалі дзядзьку чало* [1, с. 55] функцыі.

Аналіз сабранага моўнага матэрыялу дазваляе вылучыць у залежнасці ад аб'екта параўнання наступныя групы:

1) параўнанні з жывёльным светам: *Ты ж яшчэ, як ластаўка, лятаеш і шчыруеш з песняй давідна* [1, с. 33]; *Мужчынская лірыка… А ці не ў ёй, як чайка, крыляе жанчына?* [1, с. 165]; *Ляцелі, як белыя гусі, снягі, і ў кожнай сняжынцы – смяшлівы* Марозка [1, с. 186]; *...Як галубы, сівеюць аднагодкі на самай чуйнай лініі жыцця* [1, с. 115];

2) параўнанні з раслінным светам: *За стольнай бяседай – што толку! – шукаю цябе між усіх і сыплю калючкі, як ёлка, на гэтых звычайных, другіх* [1, с. 171];

3) параўнанні з прыроднымі з'явамі і стыхіямі: *Праз лёс мой ты, як бура, пранясешся, і дождж размые родны воблік твой* [1, с. 130]; *Юнацтва бессардэчнае ўдарыць, нібы гром, за перакатнай рэчкаю, за цёмным азяром* [1, с. 11]; *Смутна выблісе шлях, нібы зорка з туману* [1, с. 152]; *Там я была ўлюбёная, натхнёная тады, як чарачка разгонная, як вецер малады!* [1, с. 158]; *Яшчэ твая рука атуліць, нібы замець* [1, с. 173].

Параўнанні ў паэтычных творах Я. Янішчыц функцыянуюць актыўна, з'яўляюцца адным з вядучых сродкаў мастацкага адлюстравання і сведчаць пра вялікую любоў паэтэсы да роднай прыроды, да свайго народа, да яго побыту. З дапамогай параўнанняў Я. Янішчыц дасягае большай паэтычнасці, мастацкай нагляднасці, выразнасці, эмацыянальнасці. Параўнанні Я. Янішчыц кароткія па сваім абагульненні, але надта трапныя і ёмістыя па сэнсе. У іх распрацоўцы паэтэса заўсёды імкнулася да найбольшай прастаты, лаканічнасці і дакладнасці. Яна адбірала найбольш характэрныя прыметы і ўласцівасці таго ці іншага прадмета, з якім хацела супаставіць настрой ці перажыванне свайго лірычнага героя.

Важна адзначыць, што параўнанні, якія выкарыстоўвае Я. Янішчыц у сваіх тэкстах, глыбока паэтычныя, што, безумоўна, гаворыць пра лірызм аўтарскага светаўспрымання.

Прызначэнне і выбар параўнанняў у тэкстах абумоўліваецца аўтарскай задумай, зместам, а таксама індывідуальнасцю самой паэтэсы, якая вельмі прыдзірліва адносілася да ўласнай творчасці. Параўнанні ў яе паэтычных творах можна разглядаць як прыёмы пазнання свету. Праз іх выкарыстанне аўтар дэманструе сваю здольнасць заўважаць тонкія дэталі навакольнага свету.

Такім чынам, параўнанні ў вершах Я. Янішчыц характарызуюцца структурнай разнастайнасцю, семантычнай шматпланавасцю, якія дазваляюць адрозніваць іх ад параўнанняў іншых аўтараў.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Янішчыц, Я. Пара любові і жалю : кн. лірыкі / Я. Янішчыц. – Мінск : Маст. літ., 1983. – 223 с.